УДК 82–31

# УЗНІКНЕННЕ РАМАНА ЯК ЖАНРУ Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Лаппо Марыя Сяргееўна**
аспірантка кафедры гісторыі беларускай літаратуры
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(г. Мінск, Беларусь)

*Ключавыя словы: паходжанне рамана, сярэднявечны раман, авантурны раман, раман Новага часу, чароўная казка.*

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя пункты гледжання рускіх і замежных даследчыкаў на пачатак станаўлення рамана як жанру ў еўрапейскай літаратуры: погляд на раман як прадукт Новага часу (XVI–XVII стст.), Сярэднявечча (XII–XIII стст.) або як на пэўную «трансгістарычную структуру», якая бярэ выток у чароўнай казцы і міфах пра ініцыяцыю.*

Адно з найбольш спрэчных літаратуразнаўчых пытанняў аб рамане – гэта пытанне пра тое, адкуль бярэ пачатак раман як жанр. У дадзеным артыкуле я хацела б прадставіць найбольш вядомыя пункты гледжання на паходжанне рамана.

Многія даследчыкі лічаць раман прадуктам Новага часу, г. зн. адносяць яго ўзнікненне да XVI–XVII стст., сцвярджаючы, што толькі ў Новы час сфарміраваўся такі тып свядомасці чалавека, які адпавядаў вызначальнай рысе рамана як жанру – здольнасці весці аповед аб прыватным свеце ў прыватным тоне. Такога меркавання прытрымліваўся венгерскі філосаф XX ст. Г. Лукач, аўтар «Тэорыі рамана» (1920) [4], а таксама рускі даследчык



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

В. Кожынаў, аўтар тэарэтычна-гістарычнага нарыса «Паходжанне рамана» (1963) [1].

Паводле В. Кожынава, правобразам сучаснага рамана з'яўляецца так званы авантурны махлярскі раман, які з'явіўся ў XVI ст. і шырока распаўсюдзіўся ў іспанскай і французскай літаратуры. У такім рамане ўзнік новы тып героя, не ўласцівы папярэдняй літаратурнай традыцыі. Герой махлярскага рамана разрывае сувязі з феадальнымі інстытутамі і дабіваецца поспеху ўласным розумам, ён дзейнічае не згодна з навязанымі звонку правіламі, а ў адпаведнасці з уласнымі рашэннямі і такім чынам супрацьстаіць акаляючай яго рэчаіснасці.

Раман XVI ст. увабраў у сябе рысы ранняга перыяду Новага часу: ідэалогію сярэдняга класа, імкненне да вырашэння рэлігійных і маральных пытанняў, цікавасць да навукі і філасофіі, захопленасць рознага роду даследаваннямі і адкрыццямі. Адштурхоўваючыся ад *«нерухома-стабільных светаў рэлігійнай літаратуры, рыцарскага рамана і эпасу, раман звяртаўся да непрадказальнага жыцця вуліц і вялікай дарогі»* [5]. У адрозненне ад аповедаў пра воінскую доблесць, аповед аб прыгодах, якія выпалі на лёс розных махляроў і бадзягаў, быў завязаны на саміх прыгодах, а сацыяльная веда пра свет у такім аповедзе выклікала цікавасць сама па сабе, а не як спосаб дасягнуць высокага духоўнага ідэалу. Прыкладам такога новага падыходу было «Жыццё Ласарыльё з Тармеса» (1554) – ананімны твор іспанскага аўтара, які распавядаў пра жыццё маладога бедняка. Асаблівае месца ў гісторыі рамана займае «Хітрамудры ідальга Дон Кіхот Ламанчскі» М. Сервантэса. М. Кундэра звяртае ўвагу на асаблівасці светаўспрымання героя М. Сервантэса і, адпаведна, на асаблівасці рамана Новага часу: *«Дон Кіхот выйшаў з дому і больш не змог пазнаць свет. З адсутнасцю Вярхоўнага суддзі свет раптам падаўся жахліва мнагазначным; адзіная боская Ісціна разбілася на сотні адносных ісцін, якія людзі падзялілі паміж сабой. Так нарадзіўся свет Новай гісторыі, а разам з ім – яго вобраз і падабенства – раман»* [3].

У той жа час трэба дадаць, што аўтары аповедаў XVI–XVII стст. і нават першай паловы XVIII ст., якія мы сёння называем раманамі, зусім не разглядалі свае творы як «раманы». Яны свядома пазбягалі гэтай назвы і нават адмаўляліся ад яе. Іспанскія, англійскія, французскія творы ў загалоўках і аўтарскіх прадмовах называліся «гісторыямі», «гісторыямі жыцця» (часта проста – «жыццё») або атрымлівалі нейтральнае абазначэнне «кніга», «аповесць», «аповед». Напрыклад, М. Сервантэс называў сваю кнігу «гісторыя» і супрацьпастаўляў яе рыцарскім аповедам, якія, калі скарыстацца заключнай фразай «Дон Кіхота», *«дзякуючы маёй сапраўднай гісторыі пра Дон Кіхота, ужо захісталіся і, без сумневу, хутка зусім занепадуць»* [6].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Другая група даследчыкаў адносіць узнікненне рамана да XII–XIII стст. Такі пункт гледжання можна ўбачыць яшчэ ў працах нямецкага філосафа Г.-Ф. Гегеля, а таксама ў работах вядомых рускіх літаратуразнаўцаў XIX–XX стст. В. Бялінскага, А. Весялоўскага, В. Жырмунскага і іншых даследчыкаў.

XII–XIII стст. – час узнікнення самога тэрміна «раман». У гэты перыяд, побач з п’есамі і аповедамі, напісанымі на лацінскай мове, якія існавалі пераважна сярод прывілеяваных класаў грамадства, сталі з’яўляцца аповеды, напісаныя на раманскіх мовах (гэтыя новыя аповеды былі запатрабаваныя пераважна прадстаўнікамі дэмакратычных слаёў грамадства, якія не ведалі лацінскай мовы). Такія сачыненні сталі называць *conte roman* – раманскі аповед. Цяпер мы называем такія творы «рыцарскімі раманамі» (пра Трышчана і Іжоту, пра Трою і іншыя). Гэтыя творы адначасова нагадваюць герaічныя эпапеі Сярэднявечча і авантурна-навелістычныя казкі. Галоўная наватарская асаблівасць гэтых твораў у параўнанні з папярэднімі герaічнымі паэмамі з рыцарскай тэматыкай палягала ў новым разуменні і асэнсаванні характараў, у імкненні аўтараў акцэнтаваць індывідуальныя памкненні і ўчынкі. У стылёвых адносінах такія творы адрозніваліся ад герaічнага эпасу тым, што ў іх важнае месца займалі апісанні абстаноўкі і маналогі, у якіх аналізаваліся душэўныя перажыванні.

Нягледзячы на тое, што менавіта ў дачыненні да рыцарскіх раманаў у XII–XIII стст. ужывалася слова «раман», В. Кожынаў, як было адзначана вышэй, не лічыць гэтыя творы праобразам сучаснага рамана і звяртае ўвагу на выразнае размежаванне паміж сярэднявечнымі аповедамі і сучаснымі раманамі нават на ўзроўні выкарыстання розных тэрмінаў. Напрыклад, у сучаснай англійскай мове значэнні слоў «romance» і «novel» выразна размежаваныя. Romance – гэта празаічны ці вершаваны аповед аб прыгодах рыцараў, у той час як novel – выдуманы аповед у прозе, які паказвае характары і дзеянні, уласцівыя «рэальнаму жыццю». Як адзначае В. Кожынаў, у дадзеным выпадку сама мова сведчыць пра ўзнікненне якасна новай з’явы. Даследчык адзначае: *«... у XII–XVIII стст. раманамі называюцца героічныя казачныя аповеды «рыцарскага» тыпу; к XVIII ст. жывое развіццё гэтага жанра сканчваецца, і ў той жа час больш інтэнсіўна развіваецца зусім новы аповедны жанр, які мае толькі фармальнае падабенства з «раманам». У адных мовах для яго выпрацоўваецца новая назва, у іншых – паступова пачынае ўжывацца стары тэрмін»* [1, с. 55].

Існуе яшчэ адзін пункт гледжання адносна часу ўзнікнення рамана як жанру, які, бадай, прымае на сябе найбольшую колькасць крытычных заўваг, – гэта погляд на раман як на ўтварэнне позняй антычнасці. Многія энцыклапедычныя крыніцы адзначаюць, што «прагісторыя» рамана па-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чынаецца з антычнасці – ад часоў «Дафніса і Хлоі» Лонга, «Сатырыкона» Петронія, «Метамарфозаў, або Залатога асла» Апулея.

На першы погляд, такая пазіцыя выглядае абсурднай, бо тэматычна падобныя творы вельмі далёкія ад сучасных раманаў. Аднак, нягледзячы на рознасць апісваемых у творах рэалій і рознасць спосабаў іх апісання (у рамане Новага часу, у адрозненне ад эпасу, канфлікт не ствараецца нейкімі «вонкавымі сіламі», а іманентны самому быццю; таксама раман Новага часу ўтрымлівае значна больш дэталёвых апісанняў, часам – няўласна-простую мову героя і іншыя асаблівасці, якія не былі дамінантнымі ці нават адсутнічалі ў папярэдніх празаічных творах), нават самыя «нестандартныя» раманы XX ст. маюць падабенства з антычнымі на ўзроўні іх сутнаснай структуры.

Так, паводле Г. Косікава, раман ёсць *«трансгістарычная, інварыянтная ў часе і прасторы структура, гістарычнымі разнавіднасцямі якой з'яўляюцца антычны, усходні, заходні «сярэднявечны» і іншыя тыпы раманаў»* [2]. Даследчык адзначае, што раман як жанр характарызуецца канцэпцыяй сутыкнення чалавека з абставінамі і ідэяй выпрабавання. У традыцыйным рамане гэтыя выпрабаванні ўвасоблены ў больш-менш устойлівым сюжэце, у новым рамане яны хутчэй выяўлены ў форме духоўнага пошуку. Больш за тое – такую ж канцэпцыю выпрабавання мы сустракаем не толькі ў рамане, але ў міфе, казцы, рыцарскім аповедзе. Гэта і ёсць тая трансгістарычная агульнасць, якая яднае розныя празаічныя жанры і дазваляе правесці паралелі паміж «Адысеяй» Гамера і «Улісам» Дж. Джойса.

Як слушна заўважае Г. Косікаў, калі мы чуем сцверджанні тыпу «сярэднявечны раман не ахоплівае рэчаіснасць дастаткова поўна» або «ў гэтых раманах не стае псіхалагізму» і г.д., гэта адбываецца толькі ў выніку пераносу на сярэднявечны і антычны раманы сучасных уяўленняў аб псіхалагізме, пра асобу і яе канфлікты з асяроддзем – у выніку праекцыі праблематыкі еўрапейскага рамана XIX–XX стст. на традыцыйныя, часам вельмі архаічныя наратыўныя формы. Аднак ці маем мы рацыю, калі робім такую праекцыю? Ці мэтазгодна падыходзіць з сённяшнімі меркамі да гістарычных формаў?

Такім чынам, бачна, што, з аднаго боку, на ўзроўні структурна-сутнаснай арганізацыі раман мае еднасць нават з самымі раннімі празаічнымі жанрамі – чароўнай казкай, міфамі пра ініцыяцыю. З іншага боку, кожны гістарычны перыяд «трансфармуе» гэты жанр такім чынам, што на першы план выходзяць асаблівасці, якія не акцэнтаваліся на папярэдніх этапах.

Пытанні пра тое, калі сфарміраваўся жанр, які сёння мы называем раманам, ці ёсць пераемнасць паміж сучасным раманам і раманам Сярэднявечча, у чым адрозненне паміж «старым» і «новым» разуменнем жанру – усё гэта было і застаецца прадметам напружаных роздумаў і дыскусій літаратуразнаўцаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. Кожинов, В. В. Происхождение романа: теоретико-исторический очерк [Тэкст] / В. В. Кожинов. – Советский писатель, 1963. – 438 с.
2. Косиков, Г. К. К теории романа: роман средневековый и роман Нового времени // Библиотека кафедры истории зарубежной литературы филологического факультета МГУ им. М. В. Ломоносова. – (http://forlit.philol.msu.ru/lib-ru/kosikov5-ru).
3. Кундера, М. Ненужное наследие Сервантеса // Журнальный зал. – (http://magazines.russ.ru/ural/2001/12/Ural_2001_12_12–pr.html).
4. Лукач, Г. Теория романа (Опыт историко-философского исследования форм большой эпики) [Тэкст] / Г. Лукач // Новое литературное обозрение. – 1994. – № 9. – С. 19–78.
5. Роман // Энциклопедия Кругосвет. – (http://www.krugosvet.ru/enc/kultura_i_obrazovanie/literatura/ROMAN.html?page=0,0#part-1).
6. Сервантес, М. Хитроумный идальго Дон Кихот Ламанчский: Часть вторая // Google books. – (https://books.google.by/books?id=MdHjCQAAQBAJ&dq=%D0%B1%D0%BB%D0%B0%D0%B3%D0%BE%D0%B4%D0%B0%D1%80%D1%8F+%D0%BC%D0%BE%D0%B5%D0%B9+%D0%B8%D1%81%D1%82%D0%BE%D1%80%D0%B8%D0%B8+%D0%BF%D1%80%D0%BE+%D0%94%D0%BE%D0%BD+%D0%9A%D0%B8%D1%85%D0%BE%D1%82%D0%B0&source=gbs_navlinks_s).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова